Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 30 (59) Пятніца, 16-га верасьня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне.—Тэрыторыяльная і ку[illegible]ацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба з комунізмам.—Нацыян[illegible]рква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
" " " 3 " 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэда[illegible]страцыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
" У тэксце . —40 гр.
" На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Тры крыўды.

Беларуская моладзь сыстэматычна крыўдзілася папярэднімі польскімі ўрадамі. Пры поўным матэр'яльным сваім убожастве беларускае грамадзянства з надлюдзкім напружаньнем усіх інтэлектуальных і моральных сілаў залажыла і утрымлівала 4 беларускіх гімназіі. Сколькі ганеньняў, сколькі перашкодаў і няслушных вымаганьняў павінны былі зносіць гэтыя гімназіі!

Аднак яны вытрымалі і што год выходзілі сьвежыя, маладыя культурныя беларускія сілы з гэтых гімназіяў.

Куды?

Рабілася другая, яшчэ большая крыўда! — беларускім абітурыентам не было мейсца на сваей Бацькаўшчыне для далейшага вучэньня у вышэйшых школах, бо ўласных беларускіх унівэрсытэтаў мы не маем, а дзьверы польскіх былі для беларусаў зачынены! Мы знаходзіліся і знаходзімся у горэйшым становішчы, чым расейцы, а асабліва жыды. Ім польская ўлада дала магчымасьць трапляць да вышэйшых школаў, бо яны і багацейшыя за нас і шмат іхнім гімназіям наданы правы дзяржаўных.

Ад маёвага пераворота прайшло 1½ гады. І трэба прызнаць, што ў многіх галінах дзяржаўнага жыцьця можна заважыць палепшаньне. І трэба было спадзевацца, што і у галіне найважнейшых патрэбаў культурных беларускага народу наступяць палепшаньня. А перад усім мы чакалі, што ня толькі асобы Станіславаў Грабскіх, але і самы *рэжым міністэрства асьветы* у адносінах да беларусаў адыйдзе у *успаміны прэданьняў*. Тым часам *беларускіх пачатковых школаў* мы і у гэтым годзе *не маем.*

У прэсе зьявіліся трывожныя весткі аб здэкваліфікаваньні цэлага раду настаўнікаў беларускіх гімназіяў у Радашковічах і у Вільні, што можа зусім гібельна адазвацца на гэтых гімназіях.

Паводле тых даных, якія мы маем, галоўнаю прычынаю незацьверджаньня пэдагогаў ёсьць іх палітычная скампрамітаванасць.

Тры месяцы таму, пры першых толькі чутках аб незацьверджаньні педагогаў, мы зьмяшчалі пратэст „Прасьветы" проціў ставаньня рэпрэсыяў да тых пэдагогаў, якія палітычна заангажаваны ня былі. А цяперака мы зноў падымаем свой голас!... Мы ведаем добра, што *дух* у гэтых дзьвёх гімназіях быў ня добры. Мы ведаем, што ён да гэтага часу зусім не прайшоў, асабліва у гімназіі Віленскай Але мы *сьцьвярджаем як факт*, што дух *значна аслабеў* і гэта здарылася дзякуючы выключна *пазытыўным* крокам Ураду, а не рэпрэсыям. Але падымаючы голае у абароне дзьвёх найлепшых бел. гімназіяў — Віленскай і Радашкоўскай — мы лічым сваім абавязкам голасна зазначыць, што гэты нядобры *дух* у гімназіях з якім мы адкрыта вялі барацьбу, быў выкліканы перад усім грабаўскім рэжымам і толькі у другую чаргу ўплывам антыдзяржаўных і комунізуючых арганізацыяў. Пры чым уплыў гэты будаваўся выключна на матэрыяльным грунце: залежнасьці фінансава-бедных гімназіяў ад маючых сродкі палітычных арганізацыяў! Папярэдні шовіністычны рэжым адыйшоў назаўсёды; Грамада і іншыя комунізуючыя арганізацыі разьбіты звонку і перажываюць ўнутраны развал. Дык аздараўленьне у сярэдніх школах павінна прыйсьці само сабою. Гэта мы бачым на прыкладзе двух гімназіяў: Клецкай і Навагрудзкай, якія зусім вольны ад усялякіх уплываў комунізуючых бел. арганізацыяў. Зразумела, мы ня можам пратэставаць, калі з гімназіяў усуваюцца гэткія крыніцы палітычнай заразы, як Луцкевіч, які, будучы настаўнікам гімназіі, амаль ніколі не хадзіў на лекцыі, затое шырока ўжываў маладых хлопцаў — гімназістаў для рэдагаваньня сваіх бальшавіцкіх „Праўдаў", а сваіх „выхаванцаў" высылаў для заканчэньня адукацыі... у Менск, дзе яны складалі пісьменныя справаздачы аб дзейнасьці Бел. Нац. Рады і іншых „контр-рэволюцыйных" арганізацыяў комуністычнаму правадыру Ігнатоўскаму! Але ўсуваць з гімназіяў пэдагогаў апалітычных — рэч недапусьцімая!

„Сьпярша заспакаеньне, а потым рэформы",—сказаў калісь Сталыпін. А мы скажам: няхай *новае* міністэрства асьветы пакажа свае людзкія адносіны нават да тых гімназіяў, якімі яны можа і мелі права быць незадаволенымі і мы пэўны, што направа *духу* гімназіяў назабаўна наступіць.

Нарэшце трэцьцяя крыўда, якая рабілася беларускай моладзі, павінна быць папраўлена: Урад павінен аблягчыць магчымасьць павароту на Бацькаўшчыну з Прагі і інш. мейсцаў нявольным беларускім эмігрантам за асьветай. Гэтыя крокі павінны распачацца прад усім тым, каб ужо вярнуўшыся на Бацькаўшчыну беларускія інжынеры, дактары, аграномы і г. д. маглі зараз-жа знайсьці пасады па Бацькаўшчыне Мы ведаем, што пры новым гаспадарчым курсе ёсьць вялікая патрэба ў гаспадарчых навуковых сілах, як лясьнічыя, аграномы і г. д. А якраз у гэтых галінах ёсьць недахоп у фаховых сілах. І на заняцьця адпаведных пасадаў паводле свайго фаху беларусы тут у Зах. Беларусі маюць многа больш права, чым гастралёры з Галіцыі, тым балей, што часта чыста-гаспадарчыя пасады займаюць *неспэцыялісты*. Гэтыя пасады павінны заняць *спэцыялісты* і беларусы нараўні з палякамі.

Тады беларусы-грамадзяне Польшчы, якія з гэткім трудом шукалі і здабылі асьвету на чужыне, будуць компэсаваны. Падкрэсьліваем, што даўшы пасады беларусам паводле іх спэцыяльнасьці, ўрад можа быць пазбаўлены значных непрыемнасьцяў, якія могуць быць вывікам ужываньня антыдзяржаўнымі арганізацыямі гэтых спэцыялістаў на чале з б. чэскімі выхаванцамі для розных антрэпрызаў і авантураў.

Ад пана міністра асьветы, якому нельга адмовіць у спыненьях шыканоў беларускага школьніцтва наагул, якія з гэткім імпэтам ужываліся інстытуцыямі міністэрства асьветы пры папярэдніх міністрах — мы чакаем зьмены больш шырокай ў бок направы трох вышэйпаданых крыўдаў Беларускаму Народу.

Зьнявага Я. Станкевіча.

Віленскія газэты падалі аб чыннай зьнявазе Старшынёю Бел. Нац. Рады п. А. Паўлюкевічам п. Я. Станкевіча. Я. Станкевіч да гэтага часу (прайшло каля двух тыдняў) нідзе ў прэсе на гэтыя хронікёрскія зацемкі аб тым, што ён быў зьнеуважаны па твары, не рэагаваў. На тое мейсца на заметку „Kur. Wil" (N 202), які ў хроніцэ падаў нязгоднае з праўдаю апісаньне гэтага інцыдэнту, п. А Паўлюкевіч падаў у „Słowie" (N 203) наступнае запярэчаньне ў адкрытым пісьме:

„4 г. мес. у Вашай паважанай газэце, а роўным чынам і ў „Dz. Wil" зьявіліся зацемкі аб інцыдэнце, меўшым мейсца між мною і п. Я. Станк. Зацемкі гэтыя хаця і не падаюць падрабязнасьці, прадстаўляюць інцыдэнт згодна з праўдаю. Між тым 6 г. м. зьявілася зацемка ў „Kur. Wil", якая зусім разьмінаецца з праўдаю. Дзеля чаго ветліва прашу аб ласкавым зьмяшчэньні наступнага высьвятленьня:

3 г. м. я сустрэўся ў калідоры ваяводзтва з п. Я. Ст., рэдактарам часопісі „Народ" Ст. знаю даўно, быў нават у яго ў доме з п. Вернікоўскім. Пры ўстрэчы п. Ст не падаў мне рукі. Лічучы гэта за абразу, не рэагаваў у ўрадзе з пагляду на паважнасьць мейсца, але па выхадзе на вуліцу затрымаў п. Ст. і запытаў яго аб прычыне няпрывітаньня са мною. Ст. адказаў мне, што прычынай непаданьня мне рукі зьяўляецца палемічны артыкул у „Беларускім Слове". Я адказаў, што ў артыкуле няма нічога, што абразіла бы п. Ст. Тагды п Ст. заявіў, што гэта яго рэч, з кім ён хоча быць знаёмым, а з кім не. Я адказаў на гэта, што для зрыва адносінаў ёсьць іншыя спосабы. Ст. адказаў, што лічыць свой спосаб найлепшым. Тагды, гаворачы, што рэагую на абразу, ўдарыў Ст. па твары.

Ст. накінуўся на мяне, манічыся ўдарыць мяне партфэлем і штурхнуць нагою. Калі гэта не ўдалося, Ст. пайшоў да паліцыянта, стаяўшага недалёка, з просьбаю аб састаўленьні пратаколу „за нападзеньне на яго на вуліцы". Я паліцыянту заявіў, што гэта ня было нападзеньне, а чынная зьнявага Ст. і падаў сваю фамілію і адрэс. У часе гэтай размовы з паліцыянтам Ст. ударыў мяне кулаком па галаве, зьбіўшы саламяны капялюш і хутка схаваўся за сьпіну паліцыянта.

Пасьля інцыдэнту чакаў у працягу 24 гадзін згодна з звычаямі жэнтэльмэнаў на прадстаўнікаў Ст. Аднак прадстаўнікі яго не зьявіліся, а мяркуючы з зацемкі „Kur. Wil," дапушчаю, што Ст. лічыць агідны ўдар з-за сьпіны паліцыянта за запраўдную абарону свайго гонару і гэты ўчынак лічыць за дастатачную сатысфакцыю за чынную зьнявагу.

Спосаб ня столькі арыгінальны для вырашэньня ганаровай справы, сколькі ня згодны з пануючымі звычаямі ў культурным грамадзянстве Заходу, дзе Ст. у працягу 5 гадоў чэрпаў культуру і жэнтэльмэнскія манеры з гэткімі слабымі вынікамі.

Сьведкамі інцыдэнту апрача паліцыянта і некалькіх праходзіўшых быў п. Міх. Бабровік.

З пашанаю

А. Паўлюкевіч".

Палітычны агляд.

Чым далей, тым больш выразнай становіцца

консолідацыя Заходняй Эўропы і адмежаваньне яе ад Усходняй.

Лепшым доказам першага з гэтых палажэньняў зьяўляецца тая згода, якая пануе на адбываючайся ў Жэнэве сэсіі Лігі Народаў. Пара бурных выступленьняў і пагрозаў паасобных дзяржаваў па адрэсу Лігі мінула. Нават вечна незадаволеная Нямеччына трымае сябе зусім спакойна і не выступае проці ўнесенага польскім прадстаўніком праэкта ненападзеньня на другую дзяржаву, які хоча замяніць сабою праваліўшыся ў 1924 г. праэкт гэтак званага жэнэўскага пратаколу. Сутнасьць польскай прапазыкі ў наступным: па-першае — вайна, як сродак вырашэньня міжнарадовых канфліктаў, недапусьціма і па-другое — усякія міжнарадовыя канфлікты павінны вырашацца мірчым шляхам. Гэты праэкт зьяўляецца дапаўненьнем Заходняга Лёкарно, якое недастатачна гарантавала бясьпеку усходніх граніцаў Нямеччыны і наагул граніцаў Польшчы і Прыбалтыцскіх рэспублікаў. Дзякуючы гэтаму Нямеччына да гэтай пары не хавала таго, што яна ня можа пагадзіцца на сваю цяперашнюю усходнюю граніцу і што імкнецца да зьмены яе. Нават на падставе лёкарнскага трактату Нямеччына не магла пры помачы гвалту перарабіць сваей усходняй граніцы. Пасьля ўступленьня яе ў Лігу Народаў гэта забавязаньне Немцаў прыняло больш рэальную форму. А той факт, што Штрэзэман не выступае проці польскага праэкту, скіравана проці ўсякага нарушыцеля міру, лепш усяго сьведчыць аб наступіўшай згодзе ў Зах. Эўропе і адмове Нямеччыны ад усходняй арыентацыі і замене яе на заходнюю.

Вось дзеля чаго

бальшавікі забілі трывогу.

Яны лічаць, што Полшча захавала рад скрытых мэтаў. Перш-на-перш яна сваім праэктам агульнага дагавору аб ненападзеньні імкнецца да вырашэньня ўсіх спробаў заключыць паасобныя гарантыйныя дагаворы між Балтыкаю і С.С.Р.Р. Затым Польшча выводзіць бальшавікоў на чыстую ваду: ці яны павінны далучыцца да гэтай змовы „буржуазных" дзяржаваў, ці выклікаць абвінавачаньне ў тым, што толькі Радавая Расея перашкаджае агульнаму разбраеньню і агульнаму міру, а дзеля таго, што бальшавікі ніколі ня могуць пайсьці супольна з Лігаю Народаў і буржуазнымі дзяржавамі, дык польская прапазыка можа прывязьці толькі да таго, што Заходняя Эўропа яшчэ больш пачне узбраяцца проці саветаў, як пагражаючых агульнаму міру. І бальшавіцкая прэса адкрыта выказвае пагляд, што ў Жэнэве на цяперашняй сэсіі падгатаўляецца консолідацыя і аб'яднаньне буржуазнай Эўропы проці Радавай Расеі.

У гэтым яны, здаецца, ня мыляцца. Ведае кот, чые мяса зьеў. Насалілі ўсім па горла. Здавалася-б прыклад Пэкіна і Лёндана павінен быў-бы хоць часова устрымаць іх ад новых подласьцяў Дык нічога падобнага.

Радавы пасланнік у Парыжу Ракоўскі падпісаў адозву Комінтэрна да войска ў капіталістычных дзяржавах аб непавінавеньні.

Узрушанае францускае грамадзянства катэгарычна патрабуе выдаленьня Ракоўскага з Парыжу і нават разрыву адносінаў з Радавым урадам. Чычэрын у пісьме да Брыяна піша, што Маскоўскі ўрад не адпавядае за праклямацыю Ракоўскага, як сябра комінтэрна. Гэта аканчальна перапоўніла чашу цярпеньня францускага народу. У зьвязку з гэтым парыская газ „Фігаро" піша. „Адкліканьне Ракоўскага нічога не паправіць, бо яго заступнік будзе рабіць тое самае, што рабіў ён. Нам трэба пазбавіцца ад чырвонага пасольства, трэба парваць з Масквою" „Голуа" піша: „Разрыў з Масквою зьяўляецца неабходным варункам нацыянальнага аздараўленьня." „Тан" — Павядзеньне радавай дыплёматыі гэткае, што робіцца ўсё больш і больш немагчымым падтрымліваць адносіны з саветамі". „Журналь дэ-Дэба" — „Зусім не важна, якая асоба будзе прадстаўляць радавую ўладу. Абсурд падтрымліваць афіцыяльныя адносіны з урадам, усе дзеяньня якога скіраваны на зьнішчэньне іншых дзяржаваў." „Матэн" — „Калі Ракоўскі ня будзе той час адкліканы сваім саўдзялаўцам Чычэрыным, дык Францускі ўрад прымушан будзе прагнаць яго той час." Гэта трэба быць толькі бальшавіком з бальшавіцкім сумленьнем, каб пасьля гэткіх водгукаў прэсы заставацца ў гэтай дзяржаве хоць адну хвілю. Калі павядзеньне Ракоўскага не ўзмацніць антыбальшавіцкага фронту, дык гэтаму дапаможа яго таварыш Ульянаў, перавярнуўшы савецкае пасольства ў Варшаве ў запраўдную чрэзвычайку, куды заманен быў польскі грамадзянін Трайковіч і замардаваны чэкістамі самым страшэнным спосабам, як мардуюцца сотні тысячаў нявінных людзей ў расейскіх чрэзвычайках.

N.

Праваслаўная Царква і радавая ўлада.

ПАСЛАНЬНЕ МІТРАП. СЕРГІЯ.

У Радавай Расеі нядаўна адбылося, як ужо аб гэтым паведамлялася намі, нейкае „саглашэньне" між праваслаўнаю Царквою і Радаваю ўладаю. У выніку гэтай „згоды" заступнік патрыярха ніжэгародзкі мітрапаліт і, створаны пры ім, часовы патрыяршы сынод зьвярнуліся праз бальшавіцкую прэсу да ўсяго праваслаўнага духавенства і веруючых з адозваю, у якой мітрапаліт тлумачыць сутнасьць гэтай згоды і прызывае праваслаўнае духавенства як знаходзячаеся ў межах Расеі, гэтак сама і на эміграцыі, да лёяльнасьці ў адносінах Радавай улады. Была гэта дабравольная „згода" ці прымушаная, як і наагул ці была дасягнута гэтая згода, да гэтай пары аканчальна яшчэ ня высьвятлена. Як адняслося да гэтага закліку мітрапаліта Сергія, ўсё зарубежнае духавенства, забачым ніжэй. Яшчэ да апублікаваньня сваей адозвы мітр. Сергій зьвярнуўся да мітрапаліта Еўлогія ў Парыжу, які стаіць на чале ўсей зарубежнай праваслаўнай Царквы і дагэтуль падпарадкаваўся маскоўскаму патрыярху, з наступным „указам" часовага патрыяршага сынода:

... Выйшаўшае за граніцу з эмігрантамі наша духавенства, застаючыся да гэтай пары на службе расейскай Царкве, і не прызнаючы радавай улады, дазваляе сабе адкрыта выступаць проці яе і гэтым прычыняць вялікую шкоду Царкве. Дзеля гэтага, з мэтаю пазбаўленьня аднэй з паважнейшых перашкодаў да спакойнага істнаваньня нашай Царквы:

1) Запрапанаваць кіраўніку расейскімі Цэрквамі у Зах. Эўропе мітрапаліту Еўлогію, а праз яго і ўсім заграннічным расейскім архіпастырам і іншым сьвяшчэнаслужачым даць пісьменае забавязаньне ў гэткай форме: „Я, ніжэйпадпісаны, даю гэта забавязаньне ў тым, што цяпер, падпарадкуючыся маскоўскай патрыярхіі, не дапушчу ў сваей грамадзянскай і асабліва ў царкоўнай дзейнасьці нічога такога, што можа быць вытлумачана як выраз маей нелёйяльнасьці да Радавай улады". 2) Адмовіўшыйся выпаўніць гэты варунак да 15 (2) верасьня г.г. і не даўшы адказа на гэту прапазыку, а роўным чынам і варушыўшы прынятае на сябе забавязаньне звальняецца з пасады і выключаецца з ліку духавенства, знаходзячагася пад уладаю маскоўскай патрыярхіі.

3) Калі мітр. Еўлогі выпаўніць гэты варунак, дык застаецца на сваем становішчы.

4) У выпадку адмовы мітр. Еўлогія, духавенства безпасрэдна павінна паведаміць маскоўскую патрыярхію аб сваім рашэньні

5) Мітрапаліт Еўлогі павінен афіцыяльна паведаміць заграннічнае духавенства аб гэтай пастанове і аб сваім аднашэньні да яго і, незалежна ад гэтага, тойчас паведаміць заступніка патрыярха аб сваім прыняцьці ці няпрыняцьці запрапанавана-га забавязаньня.

НАРАДА у МІТР. ЕЎЛОГІЯ.

Паводле „Паследніх Нов." і сымпатызуючых мітр. Сергію, 2 верасьня мітр. Еўлогі склікаў у сябе нараду праваслаўных сьвяшчэнікаў парыскіх цэркваў, на якой запрошаныя аднагалосна выказаліся ў тым сэнсі, што, зусім падзяляюць агульныя палажэньні загада мітр. Сергія і часовага патрыяршага сыноду пры ім, аднак-жа ня лічаць для сябе магчымым даць падпіску ў той форме, у якой жадае загад. Даць гэткую падпіску, гэта значыла-бы зьдзейсьніць выразны палітычны акт. Сьвяшчэнаслужыцелі-ж, па жаданьню самага мітр. Сергія, павінны трымацца з боку ад усялякай палітыкі. Указвалася пры гэтым, што сэнс падпіскі гэтак невыразны і цягучы, што падпісаўшыя яе сьвяшчэнікі павінны будуць нарэшце зусім адмовіцца ад царкоўнага служэньня заграніцаю Пры шырокім тлумачэньні формулы аб „нелёйяльнасьці" можа быць прызнана нелёйяльным нават лучнасьць з эмігрантамі, пасяшчаючымі Царкву. Калі сумення выпаўняць абавязкі, жаданыя „формулаю", дык уся Заходня-Эўрапэйская парафія фактычна прымушана будзе застанавіцца і памерці, абслугівая толькі грамадзян СССР. Ісьці за гэтым, гэта значыць адмясьці ад сябе усіх прыхажан за рубежом. Думка мітр. Сергія і часовага патрыяршага сынода аб тым, чаго ён хоча ад зарубежнай эмігрантскай Царквы, павінна быць выказана выразьней і тачней. Толькі тады зарубежнае духавенства атрымае магчымасьць з ясным сумленьнем вырашыць, ці можа выпаўніць забавязаньня, патрабуемыя ад яго маскоўскай патрыярхіяй

АДКАЗ МІТРАП. ЕЎЛОГІЯ.

У Казаньні у царкве ў Парыжу мітр. Еўлогі сказаў, што патрабуемая падпіска аб лёяльнасьці радавай ўладзе ня можа быць дана. Расейская царква — заявіў уладыка— пераживае выключна цяжкія аслажненьні. Ей нельга мяшаць знаходзіць выйсьце з затрудненьня, а наадварот, трэба памагаць. У гэтым сэнсі пячатка моўчаньня па пытаньням чыста палітычным на вуснах духовенства — пытаньне неабходнасьці і царкоўнай карысьці. Гэта першае. А падругое — сіла царкоўная ў адзінстве і аб'еднаньні. Адарваўшыся ад Маткі Царквы Расейскай, мы абарачываемся ў нейкую царкоўную цень. Дзеля гэтага ўсе высілкі павінны прыкласьці да захаванасьці адзінства, павінна быць выяўляна найвялікшае цярпеньне і спакой сярод самых трудных абставінаў. („Руль").

АДКАЗ МІТР. АНТОНІЯ (ХРАПАВІЦКАГА.)

Старшыня сыноду расейскіх зарубежных архіярэяў у Юга-Славіі мітр. Антоні (Храпавіцкі) зьмясьціў у газ. „Новое Время" адказ на пасланьне маскоўскага сынода. Называючы мітр. Сергія Ніжэгародзкага (быўшага свайго вучня) сваім заўседашнім другам ішляхэтным лятуценьнікам, мітр. Антоні ўспамінае, што яшчэ ў 1927 г. мітр. Сергі задаўся лятуценьнем саўмясьціць праваслаўнае царкоўнае жыцьцё з падпарадкаваньнем расейскай зямлі радавай ўладзе. Далей мітр. Антоні пералічае „дабрадзейства" радавай ўлады на карысьць праваслаўнай Царквы ў Расеі.

Яна (радавая ўлада) арганізавала з падонкаў духавенства і ўсялякіх прахадзімцаў два абнаўленчаскіх сыноды: адзін у Макве, а другі ў Харкаве. Яна зачыніла і запячатала найвялікшую нацыянальную сьвятыню — Маскоўскі Ўсьпенскі Сабор, Салавецкі манастыр, Опціну і Сароўскую пустыню і многія іншыя, а сьв. Лаўры Маскоўскую і Кіява-Пячэрскую аддала ў руку абнаўленцаў і бальшасьць Цэркваў у іх перароблены на музэі. Яна разбурыла ўсе нашыя духоўныя школы, пачынаючы з акадэміяў і спаліла складніцы духоўных кніжак у крамах.

І гэткі, выбачайце, ўрад нас запрашаюць прызнаць, як законную ўладу і апрача гэтага паклікаюцца на словы апостала Паўла аб падпарадкаваньні ўладзе ня толькі за страх, але і за сумленьне... Уладзе разбойнікаў, якая глуміцца над усялякай верай ў Бога і перадаўшай расейскі Народ жыдам.

Мы ня губім праканаваньня тым, што мітр. Сергій знаходзіцца ў дабрасумленнай абмылцы.

Мітрапаліта Антонія ні трошкі ня пужаюць пагрозы выключэньня з ліку маскоўскага патрыярхату духоўных, якія не даюць пісьменнага забавязаньня падпарадкавацца радавай ўладзе.

Дарэмныя пагрозы — заканчвае свой адказ мітрапаліт. — Мы самі пастанавілі яшчэ на паседжаньні сабору 1924 г. невыпаўняць загадаў маскоўскага сыноду, ідучых на шкоду Царкве...

АДКАЗ АРХ. ІОАНА.

Архіяпіскап ўсей Латвіі Іоан па поваду „пасланьня мітр. Сергія" заявіў супрацоўніку рыскай газ. „Слово" наступнае:

Мітрапаліт Сергій, па свойствам свайго характару і па традыцыям прав слаўнай царквы, ня гледзячы на шчэпнетыльнасьць становішча саветаў, загаварыў з імі аб палажэньні Праваслаўнай Царквы ў С. С. Р. Р. у духу глыбейшай пакоры і кротасьці.

Царква ў „пасланьні" засьведчыла максімум магчымай хрысьціянскай лёяльнасьці, „ня гледзячы ні на што". Калі саветы і пасьля гэтага „абрашчэньня" будуць трымацца палітыкі нецярпімасьці, дык веруючыя будуць мець усе правы зрабіць, вынікаючы адсюль адпаведны вывад.

АДКЛІК ПРАФ. ГЛУБАКОЎСКАГА.

Цікавы адклік дае праф. Глубакоўскі, быўшы праф. Петраградзкай духоўнай акадэміі, а цяпер праф. духоўнай акадэміі ў Софіі. Ен лічыць, што патрабуемую савецкім урадам „падпіску" даваць нельга. На яго пагляд фактычнае становішча ў Заходня-Эўрапэйскай парафіі застанецца ранейшае: мітр. Еўлогі будзе кіраваць ёю, але ўжо незалежна ад маскоўскай патрыярхіі. Гэта будзе бежанская расейская Царква. Аўтакефалія заграннічнай царквы немагчыма па кананічным матывам: бо-ж гэта царква без выразнай тэрыторыі і насяленьня. Што-ж датычыць таго, што нейкая іншая царква магла-бы ўзяць нас, як цэлае пад свае кіраўніцтва, дык пасьля ўсяго таго, што зроблена Карлоўцамі, магчыма, ні адна царква гэтага ня зробіць. Магчыма, карлавацкія архіярэі могуць абвясьціць аўтакефалію і выбраць мітр. Антонія патрыярхам, але ніякая другая царква мусіць гэтага ня прызнае. Нам у Баўгарыі прыйдзецца проста адыйсьці ў юрысдыкцыю баўгарскай Царквы.

Мітр. Еўлогі, ведама, не дасьць падпіскі ў лёяльнасьці радавай ўладзе, бо ў гэткім выпадку ад яго адшчапілася-б усе паства. Гарэйшае, што можа здарыцца для царквы тут, гэта — страта царквы ў Парыжу на вул. Дару, куды Масква можа вызначыць свайго прадстаўніка. Тагды мітр. Еўлогію прыйшлося-бы кіраваць з Падвор'я. Але лепш згубіць царкву на вул. Дару, чым згубіць усю, ці амаль ня ўсю, паству.

ГАЛАСЫ ПРЭСЫ.

У зьвязку з гэтым варшаўская эмігрантская газэта „За Свободу" (№ 206) піша: „зусім зразумела, што па ўласнай ініцыятыве мітр. Сергій падпіскі аб лёяльнасьці жадаць ня мог, ды яшчэ ў гэткай грубай і глупай форме. Няма сумліву, што тэкст падпіскі быў прадыктаваны праз Г. П. У. Мы сябе ніякімі ілюзіямі не абманываем. Запрос сьвяшчэнікаў застанецца без адказу. Тым часам падойдзе фатальная дата 15 верасьня і зарубежныя іерархі разам з духавенствам будуць прызнаны „ворагамі бацькаўшчыны".

* * *

Орган беларускіх хадэкаў „Беларуская Крыніца" ў артыкуле пад назовай „згода праваслаўнай Царквы з бальшавікамі" піша:

Мы добра ня ведаем, што дала аснову царкоўнай ўладзе пайсьці на гэткую нечаканую і, здавалася-б, немагчымую згоду. Нам, аднак, здаецца, што гэта апошняе заваяваньне бальшавікоў будзе вельмі і вельмі дорага каштаваць радавай ўладзе. Бальшавізм, даўшы Царкве магчымасьць свабоднага разьвіцьця, адмаўляецца ад барацьбы з рэлігіяй, складае аружжа на самым магутным сваім „фронце". А калі так, дык вынікае, што бальшавікі яшчэ балей перастаюць быць сабою і прызналі абмылковасьць папярэдней абранага шляху.

БАЛЬШАВІЦКАЯ БУГАЛТЭРЫЯ.

Англія зьвярнулася да Чычэрына з нотаю пратэста проці зноў інсцэніраванага ў Петраградзе працэса 26 „англійскіх шпіёнаў", з якімі англійскі ўрад ня мае ніякай сувязі.



Чычэрын (да Чэмбэрлена): Вашую ноту мы правядзём па бальшавіцкай бугалтэрыі. Я, як камісар па заграннічным справам, запішу яе ў прыход, а мой таварыш Менжынскі, старшыня Г. П. У., запіша абвінавачаных у расход.

ЧАГО НЯ ЗРОБІЦЬ МАТКА?

Чаго ня зробіць матка для свайго дзіцяці! казала Алёна Дзітмар і пры гэтым цяжкі уздых вырываўся з яе многапакутных грудзёў, а вочы нек самі сабой уздымаліся к небу з пад тужліва выгнутых брывей.

Дзіцянё, для якога, па яе ўласнаму прызнаньню, здольная была на усе гэтая самаахвярная матка, была яе адзіная дачка — Альжбета, не так ужо і дзіцяне гадкамі; наадварот, зусім т'кі сьпелая дзеўка, якой даўно і замуж была пара. І калі яна яшчэ усе не была замужам, дык у гэтым зусім не вінавата была матка, якая гатова была зрабіць усе на сьвеце, каб здабыць ёй мужа.

Не вінавата у гэтым была і сама Альжбета, хоць людзі і казалі, што на перашкодзе стаіць яе выхаваннасьць і, што пакуль яна ня зьменіцца — ні водны мужчына не адважыцца зьвязаць свой лёс з ейным. Аднакжа — густы бываюць розныя, а выхаваннасьць ніяк ня можа лічыцца бракам, асабліва у паненкі з даўніх пор і бязпрэчна прызнанай пекнай.

Калі была тут чыя небудзь віна, дык хіба толькі з боку таты — Дзітмара. Ен служыў бугальтэрам у аднэй з вялікшых фірм і належыў до ліку тых бязьдзейных, можна сказаць, недбалых бацькоў, якія ні аб чым парупіцца ня хочуць, уважаючы, што гэтакія справы, як замужства дачкі, — робяцца неяк „самі сабой".

Алена Дзітмар гэтага на'т і слухаць спакойна не магла. Як-жа так? Жаніх знойдзецца „сам сабой"? Ды калі-ж і дзе на сьвеце гэта бывала? А сама яна ці-ж „сама сабой" выйшла замуж? О, каб яна, зложыўшы рукі чакала пакуль яе цяперашні муж папросіць яе рукі, дык і дагэтуль яна пэўне заставалася-б у дзеўках...

Не! гэткія справы ня робяцца „самі сабой" І калі бацька ня ўмее ўзяцца як сьлед за гэтую справу, дык яна сама пачне хлапатаць! Яна — матка! А матка чаго ня зробіць для свайго дзіцяці? Толькі-б' папаўся сьвежы чалавек, бо на знаёмых у родным горадзе пекнасьць Альжбеты відаць ужо не робіла вялікага уражаньня.

І вось, калі нек у тэй часьці горада, дзе жылі Дзітмары асеў і пачаў практыку малады і нежанаты доктар — руплівая матка рашыла пачаць кампанію Сама прад сабой яна ня ўкрывала, што пасаг Альжбеты малаваты для доктара, ужо, гэтак кажучы, „гатовага" і маючага практыку. Але па першае: — усім ведама, што ласьне сярод доктараў вельмі часта здараюцца ідэалістыя... А па другое: Дзітмары усе-ж т'кі багаты, калі не маемасьцяў дык стасункамі, знаёмствамі, вялікай раднёй. Гэта так-жа шанс ды і не благі у сэнсі практыкі...

— Як ты гэтага не сьцяміл? дзівілася Алена Дзітмар, выкладваючы свае пляны мужу. Гэта-ж, калі толькі адна дзясятая доля нашых крэўных схоціць па нейкай сур'ёзнай хваробе — дык у яю ужо забясьпечаны кавалак хлеба дый шчэ і з маслам...

— Ды ты-жа-ж яго і ня знаеш яшчэ зусім! нездаволена бурчэў бугальтэр.

Чыста мужчынская адповедзь! Што з таго, што яна ня знае яго? Дык яна-ж імкнецца да тога, каб пазнаёміцца. Што за дзіўная лёгіка!

Была ў іхнім горадзе адна дабрачынная інстытуцыя: „Таварыства апекі над незамужнімі маткамі", ў сябры якога ўступіў і малады новы доктар. Алену Дзітмар лёс ейнай незамужняй дачкі цікавіў куды больш чым лёс усіх незамужных матак на ўсім сьвеце, але гэта быў верны спосаб пазнаёміцца з новым доктарам і яна ўраз-жа запісалася ў сябры гэтага „Таварыства" і пачала акуратна хадзіць на ўсе яго паседжаньні.

На жаль доктар аказаўся не такім ужо руплівым сябрам і часта-густа саўсім не зьяўляўся. Дый, гэтыя бязшчасныя тварэньні, згубіўшыя шлях жаночай „цноты" мала давалі повадаў зыйсьціся бліжэй з доктарам, а нявінную Альжбету нельга жа была браць з сабой на паседжаньні гэтага „Таварыства". Калі-ж і як доктар мог убачыць і захапіцца яе харастwом?

Прыходзілася пакінуць „гэтых бязшчасных" іх уласнай долі і шукаць іншыя спосабы.

Чаго ня зробіць матка для свайго дзіцяці? У адзін прыгожы дзянёк Алёна Дзімар сур'ёзна захварэла. Запрасілі новага доктара, да якога хворая пачула вялікае даверра, як гэта яна аб'явіла дачцэ і мужу.

Доктар зьявіўся і з пэдантычнай сумленнасьцю навічка, яшчэ ня надта багатага пацыентамі, доўга і старанна стукаў, слухаў і абгледваў хворую. Не знаходзячы нічога, ён рашыў, што мае дачыненьне з нэрвовым забурэньнем і, наказаўшы спакой, зьбіраўся адыйсьці. Але хворая смутна выразіла спадзіў, што ён нічога ёй не запісаў. Каб супакоіць яе доктар рашыў запісаць ёй нейкія нявінныя кроплі і сеў дзеля гэтага да столу.

— Альжбета, — пасьпешна крыкнула хворая — прынясі доктару паперу і атрамантуl

— Дзякую, ня турбуйцеся, — сказаў доктар, вымаючы з кішані блёк-нот і алавок.

Але паненка ўжо падыходзіла з паперай і атрамантам.

— Мая дачка! адазвалася з месца хворая, паказваючы на зачырванеўшую паненку.

— Вельмі рады.. пасьпешна адказаў малады доктар, у сьпешцы губляючы блок-нот.

Яшчэ некалькі дзён бедная мучаніца не магла зыйсьці з ложка. Малады доктар, рашыўшы, што яму пашанцавала спаткаць цікавы выпадак гісторыі, аб якім ён марыў яшчэ студэнтам — прыходзіў што дня, што дня абгледваў хворую і запісваў ёй што небудзь і што дня яго аж да прадпакою праводзіла, чырванеючы, пекная Альжбета.

Адновячы і тата Дзітмар выпадкова знайшоўся дома. Хворая матка з месца ў кар'ер прадставіла доктару мужа: мужчыны сьціснулі сабе рукі А дзеля таго, што ў гэты як раз мамэнт у сталовым пакою падавалі каву, — гаспадыня, хоць сама змушаная застацца ў ложку, запрапанавала доктару філіжанку. Той з дэлікатнасьці прыняў.

За кавай разгаварыліся. Аказалася, што доктар крыху музыкант. Дык жа і Альжбета таксама — музыкантка! І матка не прапусьціла мамэнту: тут-жа яна дала дазвол дачцы запрасіць доктара на „музычны вечар". Доктар даў ахвотна сваю згоду.

На другі-ж дзень хварая паднялася з ложка, а праз тыдзень і зрабілі музычны вечар, на які прыйшоў і доктар.

Альжбета вельмі прыемна прапяяла сваім маленечкім і крыху піскучым галаском нейкі страшэнна любоўны раманс. Доктар выслухаў Потым шчэ нейкая паненка пракрычэла ува ўсю сілу сваіх плуцаў нейкую песенку. Доктар і яе выслухаў. Далей нейкі малады хлапец сеў да фартэпьяна і заіграў модны вальс. Дзьве парачкі спрабавалі па-

Раяшнік.

Вось „Нашая Праўда“ ўзяла ў абарону „спадара“ — „Сель.Саюзу“ нумар другі павадыра, які ня мае адвагі сам за сябе заступіцца і іншых змушае аб тым клапаціцца...

Але на гэтай абароне вось далібог — ня ведама, як выглядае філёлёг. —

Па філёлёгічнаму, ці па заолёгічнаму... Яму — аплявуха, а ён нагой ў бруха?!,..

Брава!!... Вось абаронцы знайшліся, лепей-бы зусім не браліся, бо за гэткую абарону — хоць памірай ад сарому.

Пане „спадару“ філёлёзе! Ці ня ляхчэй будзе свой гонар табе бараніць, як пачнеш на корачках хадзіць. Бо на абразу адбрыкнешся зразу. І сатысфакцыя будзе і павагі прыбудзе.

А „Дзень Беларускі“ абудзіўшыся ад спліну, пакінуў аб Пэрсыі пісаць успаміну і аб „з‘ездзе“ пачаў варушыцца.

Ці ня кепска ўжо стала там жыцца?!

Калі нават Касьцевіч Макар, пакінуўшы „Бел.-Дзённы“ тавар, — у іншым напрамку шукае ўжо крамку, а каб не застацца ў накладзе — аб патройным „акладзе“ у інспэктара працы пачаў клапаціцца...

Хай Божа, яму дапаможа, што хоча дабіцца.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ СЭСІЯ СОЙМУ.

На падставе дэкрэту Прэзыдэнта Рэспублікі на 13 верасьня скліканы сойм на надзвычайную сэсыю. Першае паседжаньне адбудзецца 15 верасьня.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ СЭСІЯ СЭНАТУ.

Дэкрэтам Прэзыдэнта Рэспублікі склікаңы сэнат на надзвычайную сэсію на 22 верасьня.

СЭСЫЯ КАМІСІІ ПА СПРАВАМ НАЦ. МЕНШАСЬЦЯУ.

У панядзелак адкрылася ў Варшаве сэсыя камітэта экспэртаў па пытаньням нацыянальных меншасьцяў. Апошняе паседжаньне адбылося ў пачатку ліпня. Будзе разгледжаны рад праблемаў.

РАЗЬМЕР КАТАСТОФЫ ПАВОДЗЬДЗЯ ў УСХ. ГАЛІЦЫІ.

Цэнтральны грамадзянскі камітэт запамогі ахвярам паводзьдзя паведамляе на падставе ўрадавых даных, што лічба залітых вадою паветаў дасягае 43. Лічба залітых мест у ваяводзтвах Станіславоўскім і Львоўскім — 10, лічба залітых гмін у ваяводзтвах Львоўскім, Станіславоўскім і Тэрнапольскім — 444. З поваду катастрофы паводзьдзя згінула 53 асобы. Лічба пацярпеўшых матэрыяльна дасягае 53,34+ сямействаў.

БУЙНАЯ АХВЯРА.

Мітрапаліт Шэптыцкі ахвяраваў з асабістых сродкаў 128,000 зл. для запамогі пацярпеўшым ад паводкі у Усх. Галіцыі і выпусьціў адозву па ўсяму хрысьціянскаму сьвету з заклікам аб аказаньні запамогі ахвярам стыхійнага бедства.

ПРЫЕЗД 70,000 РАБОТНІКАУ З НЯМЕЧЧЫНЫ.

У кастрычніку і лістападзе г. г. прыедуць да Польшчы з Нямеччыны сэзановыя работнікі у ліку каля 70,000 чал. на падставе польска нямецкай умовы.

З Украінскага жыцьця.

Украінскі пасольскі клюб пастанавіў выключыць камунізуючую групу „Сель-роба“, якая складаецца з 5 паслоў і 1 сэнатара.

З ЗАГРАНІЦЫ.

ПОЛЬСКІ ПРАЭКТ ГАРАНТЫЙНАГА ДАГАВОРУ.

Польскі дэлегат пры Лізе Народаў Сокаль унёс у Лігу Народаў для абмяркаваньня польскі плян гарантыйнага дагавору, які мае форму простай заявы, складаючайся з двох параграфаў, — 1) усялякая вайна, маючая вырашэньне таго ці іншага міжнарадавага канфлікту, зьяўляецца недапусьпімаю: 2) усялякія міжнарадавыя канфлікты павінны вырашацца мірным шляхам.

НЯУДАЛАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ў ЛІТВЕ.

9 верасьня а 5 гадзіне рана ў Таўрогэне (места на граніцы Усх. Прусіі) выбухла рэвалюцыя, паднятая сацыялістамі разам з камуністамі. Рэвалюцыянэры захапілі аддзел дзяржаўнага банку з грашыма, паліцэйскі ўрад і ваенную камэндатуру. Мейсцовы гарнізон увесь дзень вёў перастрэлку з рэвалюцыянэрамі. Прыбыўшыя к вечару ваенныя падкрапленьні з Клайпэды задушылі паўстаньне. Арыштавана каля 100 рэвалюцыянэраў. Галоўныя кіраўнікі здалялі схавацца. На чале паўстаньня стаялі: быўшы капітан Майюс, быўшы сябра сац. дэмакратычнай фракцыі літоўскага сойму Макальскі і вучыцель гімназіі Солтан, уцекшыя на аўтамабілі за граніцу, захапіўшы з сабою з банку 230,000 літаў. Вызначана награда у 5,000 літаў таму, хто зловіць кап. Майюса. У Коўне і многіх местах зроблены вобыскі і арышты. У гэты-ж дзень вечарам у райёне Олькенік нелегальна перашлі польска-літоўсыую граніцу дэпутаты літоўскага сойму сац. дэм. фракцыі Поплаўскас і Кейдэс, якія заявілі, што ўцяклі з Коўны, ратуючыся ад прасьлядаваньня літоўскага ўраду. Яны прыбылі да Вільні.

СЫТУАЦЫЯ ў ЛІТВЕ.

Апрача Таўрогэна былі зроблены няўдалыя спробы паўстаньня ў Аліцэ і Більказміры. Лік арыштаваных дасягае 2,000 асобаў. У многіх местах аб‘яўлена асаднае палажэньне. У Коўне дзяржаўныя будынкі знаходзяцца пад ахранаю войска. Жыхары ня могуць пасьля 8 гадз. вечара выходзіць на вуліцу. Палявы суд у Таўрогэне асудзіў 6 кіраўнікоў рэвалюцыі да сьмяротнай казьні. Асуд выкананы. У маёнтку Монькішкі быў замардаваны паліцыяй быўшы сац. пасол да сойму Мокальскі, маніўшыся аказаць супраціўленьне. Гэтак сама замардаваны на вуліцы павятовы камэндант Грыж с. Злачынцы ўцяклі.

АНГЛІЙСКІЯ РАБОТНІКІ ПРОЦІ БАЛЬШАВІКОУ.

Адбываючыйся ў Эдзінбурзе кангрэс трэд-юніонаў (рабочы саюз) на прапазыку галоўнай рады кангрэсу прыняў ухвалу аб спыненьні адносінаў з радавымі саюзамі. За гэную прапазыку галасавала 2 з паловаю мільёны работнікаў проці — 690,000 чал.

МАНЭУРЫ НЯМЕЦКАЙ ФЛЕТЫ.

Прэзыдэнт Рэспублікі Гіндэнбург выехаў разам з сваім сынам ад‘ютантам маёрам Гіндэнбургам на востраў Ругіен для прыняцьця ўдзелу ў манэўрах нямецкай ваеннай флёты.

З НАРОДНЫХ МАТЫВАУ.

Не зязюля шэра
сумна так кувае,
гэта матка сына
бедная хавае.

І ідзе за трунай,
жаласна галосіць,
і рыдае, плача,
і сыночка просіць

„Ой, ты, мой сыночак,
ой ты, мой радзімы,
на каго-ж мяне ты,
бедную, пакінуў?.

Я адна засталась,
як былінка ў полі,
хто-ж цяпер парае
мне ў маей нядолі?.

Ці-ж цябе, сыночак,
я дый не кахала,
ці-ж цябе, сыночак,
я не шанавала?.

Зазлаваўся, мусіць,
мой сыночак мілы,
што так хутка маці
бедную пакінуў.

Ой, вазьмі-ж, сыночак,
ты мяне з сабою,
нам ня будзе сумна
разам пад зямлёю.

Без цябе-ж, сыночак,
мне ўвесь сьвет ня мілы,
без цябе мне людзі
добрыя пастылы.

Выду я ў поле
пагляджу навокал,
усюды пекна, міла,
дзе ні гляне вока.

Птушкі на прасторы,
весела сьпяваюць,
і маленькім дзецям
зёлачкі зьбіраюць.

Ой, чаму-ж ня маю,
я балей сыночка?
Ці-ж я горай птушак?
Ці-ж мне доля ночка?

А як прыйдзе сьвята,
пойдуць усе гуляці,
сяду я на лаўку,
на сынка чакаці.

У пачаканьні сумным,
праляціць і ночка,
но не дачакаю,
я свайго сыночка“.

Гэтак плача матка,
сьлёзы так і льюцца,
жаласныя думкі,
ў матыў кладуцца.

Ой, на што-ж ты, маці,
бедная так плачаш?
Ты ўсё роўна сына,
болей ня ўбачыш!

Галіна.

ДАБРАВОЛЬНАЯ КАЗЬНЬ.

У зьвязку з сцьверджэньнем многіх дактароў, што сьмяротная казьнь пры помачы электрычнага крэсла выклікае гэтак званую толькі „ваабразімую сьмерць“, дацкі пісьменнік Барфод цяпер прапанаваў дабравольна падвергнуць сябе казьні на электрычным крэсьле пры варунку, што казьнь павінна адбывацца пад публічным кантролем, што павінн быць зроблены спробы прывядзеньня да жыцьця і што павінна быць забясьпечана пэнсыя яго жонцы на выпадак магчымай яго сьмерці.

ПРОСЯЦЬ ПА ДАБРУ.



Пуанкарэ і Брыян увесь час упарта дабіваюцца, каб савецкі прадстаўнік Ракоўскі пакінуў Парыж, аднак-жа Ракоўскі застаецца на сваём мейсцу.

МАСАВЫЯ КАЗЬНІ У КІТАІ.

У выніку замардаваньня некалькіх жаўнераў Фэнга ў Чан-Фу вайскі яго адказалі масавымі казьнямі, прыклада якіх да гэтуль ня было ў Кітаі. Лічба замардаваных дасягае 80,000 асобаў рознага пола і ўзроста.

2 МІЛЬЕНЫ ДАЛЯРАУ НА БІБЛІЯТЭКУ.

Група амэрыканцаў ахвяравала на бібліятэку Лігі Народаў 2 мільёны даляраў.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ПРАЦЭС 26 „АНГЛІЙСКІХ ШПІЕНАУ“.

У Петраградзе пачаўся працэс 26 гэтак званых „англійскіх шпіёнаў“ уся віна якіх заключаецца мусіць у тым, што бальшавікам трэба даказаць англійскую антырадавую кампанію ня толькі заграніцаю, але нават і ўнутры Расеі. Гэткія „шпіёнскія“ арганізацыі бальшавіцкімі чэкістамі робяцца па заказу з Крамлю на любы час і ў любым ліку „шпіёнаў“.

НОВЫЯ РАСТРЭЛЫ У ПЕТРАГРАДЗЕ.

Вялікі працэс 26 „шпіёнаў—тэрарыстаў“ на карысьць Англіі закончыўся асудам 6 на сьмяротную казьнь і 13 на розныя тэрміны турмы.

ЗАБАСТОУКА ў ПЕТРАГРАДЗЕ.

З Петраграда паведамляюць, што забаставалі работнікі цэнтральнай электрычнай станцыі з мэтаю падрымаць жаданьне ўвядзеньня 8 гадзіннага дня працы. Проці бастуючых выступіла войска, забіўшае 15 і раніўшае 10 работнікаў.

РЫХТУЮЦЦА ДА ВАЙНЫ.

Бальшавікі, дрыжучы за сваю скуру, усе свае высілкі скіравалі на ваааружэньне. Цяпер у С.С.Р.Р. маецца 83 фабрыкі ваеннага снаражэньня, 21 аэрапляновы завод, 6 пушачных, 10 парахавых, 9 стрэльбавых, 9 патронных і 10 аптычных і механічных прыладаў. 257 майстровень заняты прыгатаваньнем хімічных прадуктаў, 2 — газавых масак 1 — хірургічных прыладаў. Усяго на ваенных заводах працуе 68,000 работнікаў. Начальнік гэнэральнага штабу Тухачэўскі унёс прапазыку ў вышэйшыя савецкія органы, жадаючы, каб у бліжэйшыя два гады лік фабрыкаў быў павялічаны ў два разы, інакш ён ня можа адпавядаць за пасьпех вайны.

„СВАЯ СВАІХ НЕ ПАЗНАША“.

Варшаўская жыдоўская газ. „Наш Агляд“ паведамляе, што ў Маскве арыштавана шмат купцоў, амаль усе арыштаваныя — жыды.

круціцца па пакою. Доктар пагледзіў і на танцы. Захопленьня ніякага у яго не прыкмечалася. Але вячэра аказалася першага гатунку і доктар абяцаў заходзіць часьцей.

— Чаго ня зробіць матка для свайго дзіцяці! Сама яна страшэнна нудзілася і марылася на гэтых вечарах, дый і клапот мела па горла, аднак рабіла іх амаль не што два—тры дні. Нат‘ балей: пераканаўшыся што доктар мае слабасьць па часьці яды, у імя шчасьця свайго дзіцяці — пачала сама кратацца у кухні ля пліты, уласна-ручна робячы розныя смакалыкі.

Да канца запустаў яна зладзіла нат‘ сапраўдны баль, на якім скакалі кадрыль аж у 10 параў. Доктар пазіраў на гасьцеў дый усьміхаўся. Ен наагул ні ад чаго не адмаўляўся: еў, піў, іграў, курыў і усьміхаўся ўва ўвесь рот. Толькі вось наконт сватаньня, нек выходзіла слаба: на гэта зусім не выглядала. І гэта была асабліва дзіўным дзеля таго, што Альжбета выразна падабалася яму. Аб ёй-жа самой нічога і казаць: яна была настолькі добра выхаваная, што у адзін міг улюблялася на сьмерць у кожнага мужчыну, якога наказвала ёй матка, як будучага жаніха. Доктар быў ужо пятнаццатым ці шаснаццатым па ліку, якому яна гатова была аддаць свае дзявочае сэрца і усе іншае без астатку...

Відаць маладыя папросту баяліся выказаць адзін аднаму аб сваім каханьні, ці не маглі рашыцца на гэта.

Аднак палажэньне атрымлівалася сур‘ёзнае: матка па практыцы ведала, што гэткія справы павінна ладзіцца адразу, інакшай усё расклеівалася. Але што-ж было рабіць? Як падштурхануць, каб урэшці доктар сказаў першае слова. Дзень і ноч сушыла бедная матка сваю галаву над гэтым пытаньнем.

Заставалася толькі зладзіць сямейную вечарыну на якой, доктар мо‘ рашыўся-б. А калі-б і гэта не спраўдзілася, — ну, тады ўжо напэўна — пішы прапала!

На вечарыну гэтую доктар прыйшоў. Селі у чатырох за стол: доктар з правага боку гаспадыні, Альжбета з левага, бацька насупроць Альжбеты. За абедам завязалася гутарка. Чулася нейкая імтымнасьць, сямейны чыста настрой.

Схіліўшыся, каб падняць зьляцеўшую са стала сэрвэтку, матка убачыла, што доктар выцягнуў ногі пад сталом і амаль не датыкаў імі ног Альжбеты. Але тая свае ногі ўціснула глыбока пад крэсла

Маланкай зазігацела у галаве маткі думка: дапамагчы абаім...

Доктар не выказваў асаблівага ажыўленьня дый, відаць, калі і быў захоплены крыху настроям сямейнага сабраньня, дык гэты настрой нек не вязаўся з Альжбетай. Гаварыў ён спакойна, нат‘ крыху быццам з нуды, нямогучы; бацька і Альжбета сядзелі і слухалі маўчкі. У маткі жыва паўстаў плян дзейства.

Знячэўку доктар пачуў на аднэй сваей выцягнутай назе легкі націск жаночай ножкі. Ен крыху запнуўся, зіркнуў на Альжбету. Але у гэты мамэнт на стол падалі індыка. Матка ўстала і занялася ім. Потым сэўшы ізноў пашукала сваей нагой нагу доктара і лёганька націснула яе. На гэты раз нага доктара відаць сама шукала гэтага націску.

Адначасна доктар пачаў выяўляць нейкае ажыўленьне і зварачваўся толькі да Альжбеты. Вочы у яго загарэліся. Дзяўчына, чуючы ўзор доктара на сабе, ускінула вочкі, пачырванела і ізноў апусьціла іх. Ад гэтага яна адразу нек зрабілася пякнейшай, дый аж памаладзела гадоў на некалькі. Доктар бачыў гэта, а адначасна ізноў пачуў, што яго нага спаткалася з другой, жаночай..

Ен ужо сам старанна ёрзаў сваімі нагамі, шукаючы спатканьня з тэй, якая гэтак дэлікатна націснула пару разоў яго нагу. Але матка ужо схавала свае ногі Аднак, чуючы шмыганьне доктарскай нагі і бачучы, што ён, не знаходзячы жаданага, крыху пачаў спыняцца і выказвае пэўнае нецярплівае незадаваленьне, падсунула сваю нагу да нагі доктара.

Доктар ізноў ажывіўся, крэпка прыціснуў сваю нагу да спатканай, але тая, бы спужаўшыся — уцякла у кірунку Альжбеты.

Альжбета! налі доктару віна сказала матка.

Але ужо і без віна доктара апанаваў нейкі вясёлы настрой. Ен пачаў сыпаць жартамі, расказываў анэгдоты, сьмяяўся. Непрыкметна перайшоў з цэрэмоннага „фрэйлейн Дзітмар“ на больш інтымнае „фрэйлен Альжбета! Гэтакі настрой удзеліўся і Альжбеце: яна так-жа ажывілася, многа сьмяялася, жартавала.

„Ага! хваліць Бога наладзіла!“ уздыхнула з палёгкай матка.

І сапраўды наладжывалася. „Авансы“ матчынай нагі доктар цалком аднёс на конт ножкі Альжбеты. Маладыя чуліся зусім добра. Настрой маладых перайшоў і на старыкоў. Усім было нек лёгка, вясёла. Гадзін у 11 паважны бугальтар — бацька сеў за фартэпьяна іграць вальс Доктар, як варьят круціўся з Альжбетай па салёну, любоўна заглядываў ёй у вочы...

Альжбета прыльгнула да яго пляча і у віхры рытмічнага танца ажно вочы закрыла і адкінула галоўку бы вакханка...

Матка бачыла усё гэта і з падзякай узнасіла вочы да неба.

Праз некалькі дзён адбыліся заручыны маладога доктара з Альжбетай.

— Вось, бачыш, усе і зладзілася сама сабой — сказаў жонцы на заручынах усьцешаны бугальтар, які гэтым хацеў хоць раз паказаць жонцы сваю перавагу: казаў жа я табе. Так яно і вышла!

— Само сабой? Само сабой—ускінулася жонка, гатовая прыстыдзіць мужа і даказаць яму яго няпраўду. Але раптам спынілася і замоўкла, толькі з пагардай зьверху кінула вокам на простачка, як бы кажучы: Ах ты, дурачок, і адыйшла моўчкі. У першы раз у жыцьці апошняе слова засталося за мужам. Чаго гэта каштавала кабеціне, якая не прывыкла уступаць мужу дый першы раз у жыцьці не выявіла яму усей геніяльнасьці свайго вума і дасьціпу з якім яна зрабіла шчасьце дачкі — паказаў глыбокі уздых, які узняў яе грудзі, калі адыходзіла яна ад мужа...

Але чаго ня зрабіць матка для жыцьця свайго дзіцяці?!

(Пераробіў з нямецкага Б. Др.).

Пашырайце роднае слова!

АНТЫСЭМІТЫЗМ.

Ненавісьць насяленьня проці жыдоў, захапіўшых усю уладу ў свае рукі. расьце з кожным днём. „Комсомольская Правда" (№ 194) гэтак характэрызуе ўзрост антысэмітызму: „усе матэр'ялы з местаў гаворацць аб узмацненьні антысэміцкіх настрояў. Антысэміцкія гутаркі вядуцца ня толькі на рынках, у крамах, у трамваях. Гэты настрой захапляе і работніцкую моладзь. Белагвардзейшчына іграе збор. Спрабуем нарысаваць партрэт антысэміта, працуючага ў наш час, у варунках савецкага жыцьця. Ен можа быць стаіць у Царкве за сьвячным прылаўкам, ён, можа быць, гандлюе ў рыначнай палатцы, можа быць прымасьціўся на савецкай службе па непаразуменьню носіць камсамольскі значок. Нарэшце А. здолеў пралезьць у партыйныя рады.

Вось ён перад вамі. Пагутарыце з ім. Ен будзе тлумачыць: аб жыдоўскай нікчэмнасьці! аб жыдоўскім нахальстве! аб жыдоўскім кагале! Пасьля... ён пачне абурацца усімі наагул жыдоўскімі парадкамі: і тут дрэнна, і тут недобра! А вось раней пры Мікалае, дык было жыцьцё I напаверхні акажыцца скрытым манархістам!„

З Усходняй Беларусі.

МАБІЛІЗАЦЫЯ Ў УСХ. БЕЛАРУСІ.

На тэрыторыі Радавай Беларусі аб'яўлена мабілізацыя 5 гадоў: 1901, 1900, 1899, 1898 і 1897 г.г. 7 верасьня былі расклеяны абвесткі мабілізацыі, якая будзе цягнуцца да 11 гэтага месяца. Пасьля гэтага тэрміну не зьявіўшыяся дабравольна рэзэрвістыя будуць лічыцца дэзэртырамі і падлягаць ваенна-рэвалюцыйнаму суду. Адначасна з гэтым аб'яўлена ваеннае палажэньне на тэрыторыі поўночна-заходняга фронту. Ніхто з жыхароў не мае права паказвацца на вуліцы пасьля 10 гадзіны вечара. Мабілізацыя зрабіла вельмі моцнае уражэньне на насяленьне, асабліва вёсак. Адкрыта гавораць, што радавыя улады імкнуцца да змору голадам сялян, вызначаючы мабілізацыю на рабочы час, калі так дарагі работніцкія рукі.

МАНЭУРЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ У ДОУЖКІ ПОЛЬСКАЙ ГРАНІЦЫ.

У працягу некалькіх дзен адбываюцца на савецкім баку ўдоўжкі польскай граніцы, проці тэрыторыі Віленскага і Наваградзкага ваяводзтва і часткі латвійска-савецкага пагранічча манэўры бальшавіцкай арміі. У манэўрах прыймаюць удзел: пяхота, артылерыя, кавалерыя, тэхнічныя і лётнічыя вайска.

Непарадкі ў Усх. Беларусі.

На тэрэні Усх. Беларусі выбухлі паважныя непарадкі работнікаў у зьвязку з адмовою савецкай адміністрацыі ўвязьці 8 гадз. дзень працы ў прамысловых прадпрыёмствах. У многіх мейсцах дайшло да крывавых вулічных баёў між работнікамі і міліцыяй. Шмат работнікаў забіта і ранена. Асабліва крывавыя спатычкі былі ў Менску і Магілёве.

Тутэйшая хроніка.

— ВЫЕЗД АРХ. ФЕАДОСІЯ. 12 верасьня выехаў кіраўнік віленскай праваслаўнай парафіі архіяпіскап Феадосі. Выезд яго знаходзіцца ў зьвязку з адчыненьнем сыноду праваслаўнай царквы ў Пачаеўскай Лаўры на Валыні.

— АДЧЫТЫ Ў „БЕЛАРУСКАЙ ХАТЦЫ". На будучы час адчыты, аб якіх паведамлялася ў папярэднім нумары нашае газэты будуць адбывацца не па суботам, а па чацьверам, а 5 гадз. вечара.

З ЖЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ХАТКІ. Ст. Станкевіч, б. скарбнік беларускіх хадэкаў і сябра „Бел. Хаткі", перапужаўся зацемкі ў газэтцы „Народ", пісьмом у „Беларускай Крыніцы" заяўляе, што ён ня ёсьць сябрам Хаткі.

Дык вось мусім сцьвердзіць, што заяву аб выхадзе з Хаткі ён падаў толькі 25 VIII г.г., а да гэтага ўвесь час быў сябрам, браў удзел у канфэрэнцыі 22 траўня, быў на агульным сходзе сяброў Хаткі і не адмовіўся, калі выстаўлялася ягоная кандыдатура ў скарбнікі, але выбраны ня быў.

Урад Хаткі прыняў да ведама ягоную заяву і выкрэсьліў з сяброў Хаткі.

— „НЕПРАЦІУЛЕНЬНЕ ЗЛУ". „Беларускі Дзень" п. Умястоўскага (№ 25), абгаварываючы ўзаемаадносіны Сялянскага Саюзу п. Ярэміча (№ 1) і п. Я. Станкевіча (№ 2) між іншым піша: „Так кваліфікуець Янку Станкевіча — Ярэміч з Рагуляй (назваўшы часопіс „Народ" органам праваказарскай шайкі). Ці не занадта моцна сказана?... Бо ўсім ведама, што Я. Станкевіч — гэта запраўдны барацьбіт за адраджэньне беларускага народу"...

Калі б не чытаць гэты самы „часопіс Народ" Я. Станкевіча, дык можна было бы падумаць, што рэдактары „Народу" і „Беларускага Дня" паны Я. Станкевіч і Ф. Умястоўскі жывуць між сабою, як галубкі. Але той жа „Народ" (№ 1) „лягнуўшы" ўсе бяз вынятку беларускія партыі і арганізацыі, не абмінуў і свайго цяперашняга „абаронцу" п. Умястоўскага, назваўшы яго орган „Бел. Дзень"— „польскім часопісам у беларускай мове" і „польскім органам, *не дастаўшым інструкцыяў (ад каго? Рэд.)* у справе аддаленьня з союзу Ярэміча"...

І п. Умястоўскі ня толькі нічым не рэагаваў на гэткія „кампліменты" Спадара, але нават выступіў у яго абароне перад Ярэмічам.

Вось дык задача. Проста ня ведаеш чым вытлумачыць гэткае евангэльскае „непраціўленьне злу" п. Умястоўскага. Адсутнасьцю самалюб'я (толькі не памяці) ці літасьцю да Спадара, атрымаўшаму „чыннае ўнушэньне" за „эўрапэйскае" выхаваньне?!..

Аб тым, што лісток „Народ" зьяўляецца закансьпіраваным сьвісткам вядомага грамадаўца Луцкевіча і выдаецца на яго грошы, п. Умястоўскі можа фактычна і ня ведае?!...

— КАНФІСКАЦЫЯ „НАШАЙ ПРАУДЫ". Камісар Ураду на м. Вільно сканфіскаваў грамадаўскую „Нашу Праўду" ад 7 верасьня за распаўсюджаньне вестак, сеючых сярод мейсцовага насяленьня паніку. Гэтак сама сканфіскаваны і наступны нумар ад 10 верасьня.

— КАНТРОЛЬНЫЯ ЗБОРЫ РЭЗЭРВІСТАУ. У бліжэйшыя дні будзе выдана афіцыяльная абвестка аб кантрольных зборах рэзэрвістаў гэтага года. У бягучым годзе будуць пакліканы на кантроль наступныя гады: 1887, 1899 і 1901 г. г. Апрача гэтага будуць пакліканы на паверачныя зборы тыя рэзэрвісты старэйшых гадоў, якія да гэтуль па рожным прычынам не зьявіліся на кантрольныя зборы ў мінуўшыя гады. Маюцца на ўвазе гады: 1898, 1896, 1895, 1894, 1893, 1892, 1891 і 1890 г. Вучэбныя зборы пачнуцца 15 кастрычніка і прадоўжацца да 15 сьнежня. Ад 30 лістапада адкрыюцца дадатковыя камісыі для тых асобаў, якія па рожным повадам спазьніліся. Без падстаўныя спазьненьні пацягнуць за сабою высокую кару. 13, 14 і 15 сьнежня будуць прымусова пакліканы на кантрольныя зборы ўсе тыя, хто мусіў зьявіцца, але не зьявіўся дабравольна.

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ АД ПАДАТКУ ПРАСТОРУ З ШТУЧНЫМ ЛЕСАМ.

Віленская Ізба Скарбовая атрымала ад міністэрства скарбу загад, каб зямля, прызнаная адноснымі камісіямі прыгоднай толькі для засева леса і не засеваная ім, была звольнена ад усялякіх дзяржаўных падаткаў у працягу 30 гадоў, лічачы ад наступнага году пасьля засеву.

ПАДАТКОВЫЯ ПАЛЕГКІ.

З мэтаю падтрыманьня земляробных гаспадарак міністэрства скарбу загадала ў усіх тых выпадках, у якіх пасевы пацярпелі больш, як на 40 проц. адсрочыць залеглыя і бягучыя (за 1927 г. і раты зб 1928 г.) належнасьці падатку зямельнага і на маемасьці да 1 кастрычніка 1928 г. без узысканьня кары за спазьненьне. Гэтыя адсрочкі належыць выдаваць толькі на падставе індывідуальных заяваў. Што датычыць уласнікаў дробных гаспадарак (да 34 гэктараў), дык павінны быць узгледняны заявы агульныя, роўным чынам унескі гмінных урадаў. Палёгкаў не належыць даваць у выпадках поўнага ці частковага пакрыцьця шкоды таварыствамі. Указаныя палёгкі датычаць засадніча дзяржаўнага падатку, між тым адсрочка самаўрадавага падатку залежыць ад ухвалы данага павятовага Сойміку.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Лебедзева.

(*Маладэчанскага павету.*)

З ініцыятывы гміннае Рады, дзе большасьць Радных— беларусы, адбылася 11/IX— вечарына на карысьць паветранай флёты.

Арганізацыйны камітэт, — у склад якога ўвайшлі ад беларусоў грамадзяне: Тодар Сьвірыд — Старшыня Прасьветы і Якуб Нехвяровіч — сэкр Прасветы наладзіў спэктакль польска-беларускі, пасьля якога пеяў беларускі хор і нарэшце скокі, якія зацягнуліся далёка за поўнач.

Прад спэктаклям сказаў прамову п. вучыцель паўшэхнае школы з вёскі Маркава аб значэньні паветранай флёты ў абароне Дзяржавы.

У польскай п'есе — „Stryj przyjechał" бралі ўдзел п. п. Станіслава Касьцевічанка, Ф. Віткоўская, Уладз. Шышка, Сым Блін і Ант. Закжэўскі. Найлепш згулялі Закжэўскі і Касьцевічанка.

У беларускай п'есе — „Пільнуй сваю хату" гралі п. п. Мар'я Семашкевіч з вёскі Лобачэўка, Як. Нехвядовіч, Усев. Семашкевіч, Сым. Блін і Гр Семашкевіч. Найлепш ад іншых гралі Мар'я Семашкевіч, Якуб Нехвядовіч і Усев. Семашкевіч. І наагул абыдве п'есы прайшлі гладка і публіка, перапоўніўшая будынак straży ogniowej, была задаволеная. Рэжысіраваў спэктаклям гр. Тодар Сьвірыд.

Хор з 12 чалавек пад рэгэнтствам, п. Янкі Корсакі — сябры „Прасьветы" — прапеяў некалькі песян польскіх і беларускіх і пакінуў найлепшае ўражаньне. Добрыя галасы, добрая сьпевы і тэхнічна апрацаваны, чуткі да кіраўнічай рукі рэгэнта — гэты хор быў бы пажаданы і на'т займаў-бы і ў нас у Вільні не апошняе мейсца.

Усей вечарынай, якая прайшла вольна і весяла і ў поўным парадку кіраваў п. Божка разам з Т. Сьвірыдам і Я. Нехвядовічам. Шкода толькі, што галоўны прадстаўнік улады пан войт для свайго паляваньня выбраў не падхадзячаю гадзіну і быў адсутным пад час вечарыны, а тым больш што вечарына мела агульна-дзяржаўны характар.

Госьць з Вільні.

Беларускі спэктакль у Дзятлаве.

У нядзелю 24 жніўня г. г. тут быў наладжаны, дзякуючы стараньню гуртка белар. Т-ва„ Прасьвета". спэктакь. Прадстаўленьне адбылося у салі гэтак званага „Дома людовага". Адыгралі 3-х актовую пьесу „Страхі жыцьця" Фр. Аляхновіча вельмі добра. Прысутных было шмат. Па прадстаўленьні выступіў беларускі хор пад рэгэнствам Янкі Белуша, а Аляксандра Лазоўскі выпаўніў шмат беларускіх гумарыстычных куплетаў. Публіка засыпала яго оклясскамі. Спэктакль зрабіў вялікае ўроажаньне на тутэйшых жыхароў.

Але вось, як кажуць, не абыйшлося і бяз ліха. Бачучы моцнае ўражэньне, зробленае беларускім тэатрам на публіку, ксёндз-дзекан Язэп Жэра ні з таго, ні з сяго забараніў беларусам карыстацца саляю ў г. зв. „Доме людовым". Публіка ня можа дачакацца новага прадстаўленьня, а гурток ня мае адпаведнага для гэтага лёкалю

Як аказалася потым, ксёндз-дзекан ня толькі спалохаўся пасьпеху беларускага тэатру, але яшчэ быў вельмі незадаволены, калі пачуў, што сябры уласнай яго эндэцкай арганізацыі г. зв. „Koła Młodzieży Polskiej" сталі перахадзіць у арганізацыю Т-ва „Прасьветы", у той час, як на тыя спэктаклі, якія эндэкі ставілі, публіка не хадзіла і яны праваліваліся, гэта не падабалася ксяндзу-эндэку і ён пачаў шкодзіць на кожным кроку Т-ву „Прасьветы". Вось ужо прайшло болі месяца, а Т-ву „Прасьветы" ня ўдалося адыграць новы спэктакль, бо няма у м. Дзятлаве адпаведнай салі. Цікава адзначыць, што ксёндз-эндэк Жэра ня толькі не дае салі нам Беларусам, але таксама забараняе карыстацца саляй гэтай ў г. зв „Доме Людовым" і дэмакратычнай польскай арганізацыі „Strzelców".

„Пагалоска".

7 — IX — 27 г. Дзятлава.

Патрэба арганізацыі.

(*Стаўпецкі павет.*)

Цяжка жывецца цяпер нашаму селяніну. А чаму гэта? Цяжка таму, што сяляне ў большасьці малазямельныя і зусім не з'арганізаваны. Па вёсках нашага Стаўпецкага павету ня толькі няма палітычных партыяў, але нават прасьветна-культуральных. Праўда, ёсьць у некатарых вёсках гурткі Таварыства Беларускае Школы, але яны зусім ніякай прасьветнай працы не вядуць. Патрэба-ж гэтай працы моцна адчуваецца вёскай Старыя сяляне большасьцю непісьменныя, малодшыя трохі нават і гарнуцца да працы над пашырэньнем асьветы, але моладзь? Яна калечыцца ў польскай школе, а вышаўшы са школы, хутчэй усяго ідзе вучыцца за рамесьнікаў: краўцоў, шаўцоў, кавалёў, столяроў і г. д

Нам цяпер патрэба маладых барацьбітоў за культуральнае вызваленьне Нашага Народу. Але нажаль, іх зусім мала.

Грунт-жа для працы ёсьць. Хутка надыходзіць зіма. У гэтую пору сяляне маюць шмат вольнага часу, які трэба як найлепей выкарыстаць. І вось цяпер — у восені якраз добра арганізаваць па вёскам гурткі „Прасьветы" і „Бел. Нац Партыі". Пры гуртку трэ' закладаць народныя дамы, бібліятэкі, чытальні, супольна выпісваць газэты і інш. Апрача таго трэба ставіць спэктаклі і наагул прыўчаць моладзь і сялян да грамадзкай працы. Не праз партыйную грызьню, але праз нашу прасьветную працу на карысьць Бацькаўшчыны мы дакажам, што варты называцца яе сынамі. Дык, дарагія браты, закладайце гурткі „Прасьветы" і „Бел. Нац. Партыі".

Малазямельны.

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Наша вёска вельмі вялікая: бо цягнецца больш, як на дзьве вярсты, а ўсіх жыхароў ад 20 гадоў лічыцца каля 1500 чал. Ужо даўно, як пачалі ўсе цікавіцца сваімі беларускімі справамі, сваім родным словам. Асабліва цяпер, калі недалёка выбары ў сойм. А гэтак сама хочацца даведацца праўды, ўласьне праўду, хто наш вораг, а хто прыяцель, што робіцца на сьвеце, а перад усім на нашай Бацькаўшчыне.

Даходзіла да нас „Наша Праўда", але жыхары нашае вёскі нічога добрага там ня ўбачылі, апрача галосных слоў і хітрага ашуканства і ніхто за імі не падумаў нават ісьці. Цяперака стараецца нейкі „Сельсаюз". Але і ён ідзе тэй дарогай, што і Грамада. Хто-ж за ім пойдзе?

Дзеля гэтага мяне, як паверанага па ліквідацыі сэрвітутаў і камосацыі „gruntów" нашых, просяць жыхары вёскі выпісаць ім газэты і праграму Беларускае Нац. Рады і Партыі. Прашу Вас, калі ласка, выслаць пакуль што да падпіскі для азнаямленьня пробныя №№ Вашае паважанае газэты „Беларускае Слова" наступным асобам:

Роман Ромашко, Рыгор Сасіновіч, Язэп Лапата, Максім Ахрэменя, Ян Сасіновіч, Міхась Абабурка, Сьпірыдон Рамашка, Марк Гарошка, Базыль і Андрэй Абабурка, па адрэсу:

Poczta Zaostrowicze, **wieś Morooz, powiat Nieświeżski z Nowogródzka.**

Дня 15 жніўня 1927 г.

З пашанаю
паверааны на вёску
Рыгор Рудко.

АД РЭДАКЦЫІ: Па прасімым адрэсам газэты выслалі. Праграму Партыі і Статут „Прасьветы" высылаем.

Рада ка упартых.

(*Байка*)

Праз мост на Немне ці Вяльлі —
Асла адновячы вялі.
Асёл — ведама ўсім —
Вельмі ўпартая скаціна.
З ім —
Бы з той благой жанчынай,
Калі нечага ўпрэцца,
Ніхто ладу не даб'ецца.
Дык вось і тут. Асёл з пачатку
З гаспадаром быў у парадку:
Шоў за ім спакоўна, ціха,
Аж да паловы мосту. А тут —
Якоесь улезла яму ліха,
Упёрся і капут:
Бы ўрос у мост нагамі,
Стаіць ды хляпае вушамі!
Напрасна гаспадар хлапоча:
То ласкай просіць, то зноў лае
То пугай плясьне — той нядбае,
І з месца скрануцца ня хоча!
Гледзячы як гаспадар з ім б'ецца,
Прахожы аж за брух бярэцца,
І з рогатам дае ўсяк раду:
Той — „цягні"! — другі — „пхні з заду"!
Аднак жа ўсё выходзіць дрэнь:
Асёл здубеў, стаіць бы пень.
Урэшце някі прахожы
Кажа: „тутка не паможа,
Ані біцьцё ні папіханьне,
Іншае тут трэ стараньне.
Упартасьць каб асла зламіць,
Трэба фартэля ўжыць:
Ен дурны хоць і ўпарты,
Дагэтуль строіць з вамі жарты,
Паказвае свой тым задор,
Што робіць усё наперокар.
Дык вось, асла ісьці каб змусіць
Далей праз мост,
Яго ўзад цягніце вы за хвост.
Яго напэўна гэта скусіць
І, каб на злосьць вам зноў зрабіць —
Ен жыва ўперад пабяжыць".

—— .. ——

Гаспадар галоў чухнуў,
За хвост хапіўся, пацягнуў.
Асёл зірнуў, і
Вухамі стрыгануў
Уперад з усіх ног пусьціўся
Аж пыл стаўпом з пад ног круціўся...
І гаспадар не аглянуўся,
Як мост у іх з заду апынуўся.—

—— .. ——

Добра і ўпартых за нос водзяць,
Калі ў іх глупоце саюзьніка знаходзяць.

Б. Друцкі.

ЖЫУ КУРЫЛКА.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу не адмовіць наступнага:

Дня 27-га жніўня г. г. атрымалі на імя „Koła Młodzieży Wiejskiej" адозву даўно памёршай і згніўшай сьмярдзючай „Niezależnej Partji Chłopskiej". Перасылаючы пры гэтым гэту ластаўку, прашу паведаміць аб тым, што мы, нацыяналісты, нічога супольнага ня хочам мець з лідэрамі, камунізуючымі шэрыя беларускія масы. Калі-б ведаў адрэс N. P. Ch, дык сам адаслаў бы ім.

З пашанай
А. Мікірэй.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.